# ПАТЭНЦЫЯЛ САЙТА ДЗЯРЖАЎНАГА КАТАЛОГА МУЗЕЙНАГА ФОНДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ДЛЯ АДУКАЦЫІ І ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

**Н. У. Гермацкая,** *загадчык аддзела інфармацыйна-метадалагічнага забеспячэння дзейнасці Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь;*

**Л. С. Скакун,** *загадчык метадычнага сектара інфармацыйна-метадалагічнага забеспячэння дзейнасці Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мы жывём у эпоху, калі глабальная сетка Інтэрнэт стала важнай часткай культурнага жыцця ў цэлым і жыцця ўстаноў культуры, у тым ліку музеяў, у прыватнасці. Сёння ўжо можна гаварыць пра існаванне паралельнага жыцця музеяў у рэальным і віртуальным свеце. Музейныя прадметы цяпер можна убачыць на віртуальных экскурсіях, выставах, у лічбавых каталогах калекцый як асобных музеяў, так і зводных каталогах музейных фондаў розных краін свету: напрыклад, Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Расійскай Федэрацыі (http://goskatalog.ru), Нацыянальны каталог Музейнага фонду Латвіі (http:// www.nmkk.lv), Каталог Музейнага фонду Партугаліі (http:// www.matriznet.imc-ip.pt), Галоўны каталог Музейнага фонду Францыі (http://www.culture.gouv.fr), Лічбавая сетка калекцый музеяў Іспаніі (http://ceres.mcu.es), Лічбавы музей Нарвегіі (http://www.digitaltmuseum.no), Лічбавы музей Швецыі (http:// www.digitaltmuseum.se).

3 лістапада 2010 г. пачаў працаваць сайт Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь (размешчаны па адрасе www.dkmf.by).

Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь (ДКМФ) – электронная база даных, якая ўтрымлівае асноўныя звесткі аб музейных прадметах, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь. Арганізацыйна-тэхналагічная структура Дзяржаўнага каталога ўяўляе тры ўзроўні: ніжні – лакальныя электронныя каталогі музейных устаноў; сярэдні – тэхналагічная база, у якой утрымліваюцца асноўныя звесткі пра музейныя прадметы (па 21 полю апісання); верхні – сайт Дзяржаўнага

каталога. Верхні ўзровень ДКМФ вядзецца на трох мовах: рускай, беларускай, англійскай. Сайт утрымлівае інфармацыю, неабходную для музейнага спецыяліста, у тым ліку нарматыўна-прававыя акты, метадычныя і метадалагічныя матэрыялы (уніфікаваныя даведнікі матэрыялаў, тэхнік/тэхналогій вырабу музейных прадметаў, класіфікатар па тыпу/віду/разнавіднасці, стандарты апісання музейных прадметаў), спасылкі на электронныя калекцыі разнастайных музеяў, сайты дзяржаўных каталогаў і інш.

Але асноўнае, што прадстаўлена на сайце, гэта інфармацыя пра музейныя прадметы: фотаздымак і кароткае апісанне (назва ўстановы, дзе захоўваецца прадмет, прадметная і аўтарская назва, аўтар, месца і дата стварэння, памеры, матэрыял і тэхніка). Супрацоўнікамі Цэнтра Дзяржаўнага каталога з агульнай базы музейных прадметаў на сайт выстаўляюцца найбольш цікавыя і атрактыўныя прадметы з калекцый музеяў Беларусі.

Вышэйсказанае дае падставу сцвярджаць, што мэтай верхняга ўзроўню Дзяржаўнага каталога з'яўляецца забеспячэнне шырокага доступу да музейных прадметаў і музейных калекцый. Адпаведна мэце можна вызначыць наступныя задачы:

– прэзентацыя каштоўнасцей беларускай культуры;

– папулярызацыя ведаў аб гісторыі, культуры і мастацтве Беларусі;

– прадастаўленне пляцоўкі для развіцця прафесійнага абмену інфармацыяй паміж даследчыкамі розных галін ведаў і розных краін.

Сайт Дзяржаўнага каталога адкрывае шматлікія магчымасці перад музеямі, якія супрацоўнічаюць з ДКМФ: заявіць пра сябе і пра свае калекцыі; пашырыць культурна-адукацыйную дзейнасць; садзейнічаць у прадухіленні небяспекі нелегальнага перамяшчэння культурных каштоўнасцей і г.д.

Згодна статыстыцы сайта Дзяржаўнага каталога, колькасць яго наведвальнікаў паступова расце. Зразумела, што гэта не толькі музейныя супрацоўнікі, але і студэнты, і людзі, якіх проста цікавіць інфармацыя, пададзеная на сайце. Таму, відавочна, што адна з асноўных функцый сайта Дзяржкаталога – інфармацыйная, якая, у сваю чаргу, з'яўляецца віртуальным працягам культурна-адукацыйнай і выхаваўчай дзейнасці саміх музеяў.

Сёння на сайце Дзяржкаталога прадстаўлены прадметы з розных музейных калекцый: асабістыя рэчы дзеячаў беларускай літаратуры, культуры, мастацтва, археалагічныя помнікі, прадметы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

побыту, культу, жывапісныя і графічныя творы, друкаваныя выданні, рукапісы, нумізматычныя калекцыі, натуральна-гістарычныя крыніцы, помнікі народнага дойлідства і інш. Электронная копія музейнага прадмета мае тыя ж асноўныя якасці, што і рэальны музейны прадмет: інфарматыўнасць, рэпрэзентатыўнасць і экспрэсіўнасць. Дзякуючы гэтаму музейны прадмет з’яўляецца найважнейшым сродкам адукацыйнага працэсу не толькі ў музеі, але і ў віртуальнай прасторы. Ён іграе першарадную ролю ў працэсе атрымання ведаў, паколькі з’яўляецца першакрыніцай, сапраўдным сведчаннем і перакананаўчым доказам гістарычнага мінулага або сучаснасці нацыянальнай і сусветнай культуры.

Адукацыйны патэнцыял верхняга ўзроўню Дзяржкаталога заключаецца ў магчымасці не толькі адлюстроўваць асобныя прадметы з розных музеяў Беларусі, але і прэзентаваць цэлыя комплексы музейных прадметаў пры дапамозе віртуальных выстаў. У снежні 2011 г. на сайце Дзяржаўнага каталога была створана першая віртуальная выстава «Зімовыя паштоўкі з мінулых стагоддзяў», на якой пададзены паштоўкі розных часоў і краін, звесткі пра іх гісторыю і асаблівасці. Наступная выстава – «Велікодны падарунак» – з’явілася ў красавіку 2012 г. На выставе можна пазнаёміцца з асноўнымі атрыбутамі Вялікадня, іх сімволікай і значэннем у беларускай культуры. Найбуйнейшай на дадзены момант стала выстава «Першая сусветная. На ўсход ад лініі фронту», створаная ў жніўні 2012 г. На ёй прадстаўлены з фотаздымкі і дакументы, якія тычацца непасрэдна падзей і з’яў ваеннага часу ў Беларусі. З кастрычніка 2012 г. на сайце пачалі працаваць і выставы аднаго дня, прымеркаваныя да міжнародных, нацыянальных свят, памятных дат: 1 кастрычніка – «Міжнародны дзень музыкі», 4 кастрычніка – «Запуск першага штучнага спадарожніка Зямлі», 9 кастрычніка – «Сусветны дзень пошты», 12 кастрычніка – «Сусветны дзень яйка», 14 кастрычніка – «Дзень Маці. Пакроў Прасвятой Багародзіцы» – «Матулям прысвячаецца», 15 кастрычніка – «Міжнародны дзень сельскіх жанчын», 25 кастрычніка – «Свята млынароў Беларусі». Дзякуючы такім міні-выставам наведвальнік сайта мае магчымасць даведацца пра адметнасць пэўнай даты, а таксама пазнаёміцца з музейным прадметам, які характарызуе яе. Напрыклад, да выставы аднаго дня «Міжнародны дзень сельскіх жанчын» быў падабраны прадмет з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры – сувенір, які належыў У.С. Караткевічу. Прадмет у выглядзе статуэткі вясковай жанчыны з кошыкам яскрава адлюстроўвае тэму свята і ў той жа час дазваляе спазнаць шматгранную асобу беларускага пісьменніка, які быў яшчэ і актыўным калекцыянерам. На віртуальнай выставе да «Сусветнага дня яйка» можна ўбачыць незвычайнае гранітнае яйка XII ст. з Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі, якое выкарыстоўвалася ў пахавальным абрадзе.

Адметнасцю віртуальных выстаў сайта Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь з'яўляецца тое, што тут можна змясціць побач музейныя прадметы, якія часцей за ўсё праблематычна ўбачыць разам на выставах у музеях краіны. Падабенствам віртуальных і рэальных выстаў з'яўляецца сам працэс іх стварэння, бо ў аснове ляжыць канцэпцыя, якая вызначае ідэйны змест, прынцыпы адбору прадметаў, іх сістэматызацыю, інтэрпрэтацыю. Прадметы, аб'яднаныя пэўнай тэмай, не толькі даюць разнастайную інфармацыю, але і ўзбуджаюць пачуццё кантакту з адлюстраванымі ў іх падзеямі, аказваюць эмацыянальнае ўздзеянне на карыстальніка, садзейнічаюць фарміраванню павагі да айчыннай гісторыі і культуры.

Ужо сёння можна гаварыць аб вялікім адукацыйным патэнцыяле сайта Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Але ў поўным аб'ёме гэты патэнцыял можа быць выкарыстаны толькі ў тым выпадку, калі ў Дзяржаўным каталогу Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь змесціцца асноўны фонд кожнага з музеяў Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Виртуальная* выставка «М.А. Врубель». – URL : http : //www. virtualmuseum.ru/exhibition/vrubel/ru/about.

2. *Дзяржаўны* каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. – URL : http : //dkmf.by.

3. Коллекции Государственного Дарвиновского музея. – URL : http : //www.darwin.museum.ru/_collection. – Дата доступа 25.10.2012.

4. *Кузьмина, Е.С.* Международные информационные системы описания музейных предметов на основе компьютерных изображений / Е.С. Кузьмина // Третья международная конференция «АДИТ-99». – URL : http : //www.adit.ru/adit99/thesis/td604_r.htm.

5. *Лебедев, А.В.* Музейные представительства в Интернет. Российский и зарубежный опыт / А.В. Лебедев // Музеи и новые информационные технологии. – М. : Прогресс-Традиция, 1999. – С. 108–122.

6. *Мастеница, Е.Н.* Образование в контексте социальных функций музея / Е.Н. Мастеница, Л.М. Шляхтина // Образовательная деятельность

художественного музея : труды Российского науч.-практ. центра по проблемам музейной педагогики. – СПб., 2000. – Вып. 6. – С. 45–51.

7. *Музей* будущего : информационные технологии и культурное наследие. – URL : http ://www.future.museum.ru/default.htm.

8. *Ноль, Л.Я.* Информационные технологии в деятельности музея : учеб. пособие / Л.Я. Ноль. – М. : РГГУ, 2007. – 204 с.

9. *Русский* музей : виртуальный филиал. – URL : http : // www. virtualrm.spb.ru/ru/about.

10. *Уніфікацыя* сістэмы апісання музейнага прадмета (Спроба стварэння ўніфікаваных даведнікаў для электронных баз даных) / Нац. гіст. музей Рэсп. Беларусь ; укл. В.У. Мірончык. – Мінск, 2009.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ